# Праграма развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту сродкамі фальклору

*Хворак Таццяна Аляксандраўна*

УА " Брэстскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна "

З мэтай развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту намі распрацавана праграма “Маўленчая вясёлка” па аптымізацыі працэсу развіцця беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту сродкамі фальклору.

Мэта праграмы: развіваць беларускае маўленне ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту сродкамі фальклору.

Задачы:

1. Пазнаёміць дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту з малымі творамі беларускага фальклору.
2. Выкарыстоўваць вялікую колькасць сродкаў фальклору ў стварэнні моўнага асяроддзя ў штодзенным жыцці дашкольнікаў і актыўна далучаць дзяцей да размовы на беларускай мове.
3. Развіваць культуру маўлення і маўленчых зносін.
4. Выхоўваць жаданне размаўляць па-беларуску.

Праграма ажыццяўляецца ў наступных напрамках: развіцце звязнага маўлення, пашырэнне слоунікавага запасу, граматычны лад маўлення, развіцце гукавай культуры маўлення.

Праграма прызначана:

- садзейнічаць развіццю беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту праз знаёмства з малымі творамі беларускага фальклору;
- стварыць моўнае асяроддзе ў штодзенным жыцці дашкольнікаў, якое дазволіць актыўна далучаць дзяцей да размовы на беларускай мове;
- развіваць культуру маўлення як сістэму камунікатыўных якасцей маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, багацце і разнастайнасць, дарэчнасць, чыстата і лаканічнасць);
- выхоўваць жаданне размаўляць па-беларуску праз азнаямленне дзяцей з малымі творамі фальклору, развіццё ў іх уменняў слухаць і разумець творы, аналізаваць іх, узнаўляць (чытаць на памяць, пераказваць казкі і апавяданні). Мастацкае слова, сродкі мастацкай выразнасці (метафары, параўнанні, прымаўкі і іншыя) павінны стаць здабыткам дзіцяці, якім яно будзе карыстацца ў штодзённым жыцці.

Праграма пабудавана на аснове прынцыпаў засваення мовы і маўлення дзецьмі, якія адлюстроўваюць спецыфіку навучання дашкольнікаў роднаму маўленню:

– узаемасувязі сенсорнага, разумовага і маўленчага развіцця дзяцей;
– камунікатыўна-дзейнаснага падыходу да развіцця маўлення;
– развіцця чуцця мовы;
– фарміравання элементарнага асэнсоўвання з'яў моў;
– узаемасувязі работы над рознымі кампанентамі маўлення, развіцця маўлення як цэласнагаўтварэнн;
– узаемасувязі навучання розным відам маўленчай дзейнасц;
– узбагачэння матывацыі маўленчай дзейнасц;
– забеспячэння актыўнай маўленчай практыкі.

Выкарыстанне фальклорных твораў у рэжымных момантах ажыццяўляецца наступным чынам.

Раніцай, сустракаючы дзяцей, выхавальнік вітаецца па-беларуску: добрай раніцы, добры дзень, прывітанне. Ацэньвае знешні выгляд: “Глянуўшы ў твар, не пытай пра здароўе”, “Сам добры і людзі добрыя”.

Пад час заняткаў выкарыстоўваюцца пальчыкавыя гульні, ілюстрацыі і загадкі да іх. Праводзіцца завучванне падабраных фальклорных твораў пад час вольнай дзейнасці дзяцей, для гэтага выкарыстоўваецца нагляднасць і музычныя інструменты (бразготка, бубен, званочак, лыжкі).

У ходзе прагулкі, у залежнасці ад надвор’я, можна выкарыстоўваць заклічкі пра сонейка ці пра дожджык, расказваць народныя прыкметы.

Мэтазгодна выкарыстанне пацешак на беларускай мове перад сном.

У полудзень праводзіцца сюжэтна-ролевыя гульні, у якіх выкарыстоўваюцца заклічкі.

На прагулцы варта праводзіць рухавыя гульні (“Грушка”, “У ката”, “У мядзведзя ў бары” і іншыя), якія можна пачаць з лічылак на беларускай мове.

На працягу ўсяго дня адбываюцца розныя сітуацыі, дзе раскрываюцца значэнні многіх прыказак і прымавак. Паўторнае прыгаворванне заклічак, лічылак, прыкмет дазваляюць дзецям запамінаць правільнае вымаўленне слоў.

Такім чынам, калі дзеці слухаюць эмацыянальна насычаныя  фальклорныя творы, заўважаюць выразныя сродкі маўлення, запамінаюць пастаянныя эпітэты, адчуваюць прыгажосць паэтычнай метафары, гучнасць рыфмаванага радка, яны вучацца мове. Вялікая колькасць выразна-выяўленчых сродкаў, гучнасць, рытмічнасць, напеўнасць, займальнасць малых форм фальклору цікавяць дзяцей, выклікаюць у іх жаданне паўтарыць, запомніць, выклікаюць ў дашкольнікаў жаданне гаварыць на роднай мове трапна і прыгожа.

Пры апрабацыі нашай праграмы па развіццю беларускага маўлення ў дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту сродкамі фальклору мы карысталіся, у залежнасці ад характару маўленчай дзейнасці дзяцей, рэпрадуктыўнымі і прадуктыўнымі метадамі развіцця маўлення.

Рэпрадуктыўныя метады заснаваны на ўзнаўленні маўленчага матэрыялу, на перайманні гатовых узораў. Гэта, напрыклад, пераказ беларускіх народных казак блізка да тэксту, завучванне на памяць пацешак, гульні-драматызацыі па змесце фальклорных твораў.

Прадуктыўныя метады накіраваны на навучанне дзяцей пабудове ўласных звязных выказванняў, развіццё маўленчай творчасці. Да гэтых метадаў адносіцца абагульняльная гутарка, расказванне, творчы пераказ, мадэляванне, творчыя заданні. Для дзяцей малодшага ўзросту гэты метад даволі складаны, паколькі ў даным ўзросце добра праяўляецца схільнасць дзяцей да гукаперайманні, што з’яўляецца благапрыемным фактарам для развіцця актыўнага маўлення. Пры паўтарэнні за выхавацелем словы і сказы, дзеці не толькі запамінаюць іх, але і практыкуюцца ў правільным вымаўленні гукаў і слоў, замацоўваюць артыкуляцыйны апарат.

Такім чынам, можна падвесці вынік: каб навучыць дзяцей размаўляць па-беларуску, недастаткова толькі знаёміць іх з творамі на роднай мове, патрэбна стварыць умовы для яе развіцця. Вялікая роля тут належыць выхавальніку.

Выкарыстанне сродкаў фальклору ў сваёй працы дапамаглі нам зрабіць наступныя вынікі:

- Фальклор захапляе малодшых дашкольнікаў яркімі і знаёмымі паэтычнымі вобразамі (коцік, зайчык, птушка і іншыя), дапамагае зразумець, што добра, а што – не.
- Прастата і меладычнасць гучання малых формаў фальклору дазваляе дзецям малодшага ўзросту лёгка іх запомніць, паколькі ў даным ўзросце добра праяўляецца

схільнасць дзяцей да гукапераймання, што з’яўляецца благапрыемным фактарам для развіцця актыўнага маўлення. Пры паўтарэнні за выхавацелем словы і сказы, дзеці не толькі запамінаюць іх, але і практыкуюцца ў правільным вымаўленні гукаў і слоў, замацоўваюць артыкуляцыйны апарат.

- Чым раней дзеці “пагружаюцца” у моўнае асяроддзе, тым лепей і хутчэй развіваецца іх звязнае маўленне.

Такім чынам, праграма дазваляе наладзіць працэс развіцця беларускага маўлення эмацыянальна пад час заняткаў і рэжымных момантаў, развіваць беларускае маўленне сродкамі фальклору, пазнаёміць дзяцей з малымі творамі беларускага фальклору, узбагачаць і замацоўваць актыўны слоўнік дзіцяці на аснове ведання малых фальклорных твораў і ўяўленняў пра навакольнае жыццё, разумець ўсведамлённа значэнне слоў.